**М. А. Курыпка**

# ТРАНСФАРМАЦЫЯ ЖАНРУ ГІСТАРЫЧНАЙ ПРОЗЫ Ў СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ (псіхадрама “Пятнадцаць лішніх хвілін” С. Балахонава)

У эпоху постмадэрнізму, якая аддае ўвагу пераважна суб’ектыўнаму спазнаванню рэчаіснасці, сістэма гістарычна ўсталяваных традыцыйных каштоўнасцей змяняе сваё напаўненне. У постмадэрнісцкім творы гістарычныя падзеі набываюць розныя інтэрпрэтацыі, што дазваляе аўтару падкрэсліць немагчымасць спасціжэння гістарычнай рэчаіснасці. Постмадэрнісцкая дэцэнтралізацыя прыводзіць да таго, што аўтара пачынаюць цікавіць не вядомыя значныя падзеі мінулага, а малыя камерныя гісторыі, часта не зафіксаваныя ў пісьмовых сведчаннях.

Немагчымасць спасціжэння аб’ектыўнага адлюстравання рэчаіснасці адзначаў Р. Барт. У прыватнасці, у сваёй працы “Гістарычны дыскурс” (1967) ён ставіць пытанне аб адноснасці гістарычнай аўтэнтычнасці і непазбежнага разрыву паміж гістарычнай праўдай і расказам аб ёй. Такога ж погляду прытрымліваецца Дж. дэ Гроот, які сцвярджае, што “асновай жанру гістарычнай прозы з’яўляецца канструяванне альтэрнатыўнай гістарычнай рэальнасці, каб нанова даследаваць канкрэтыку гістарычных падзей, якія ўжо ўстаяліся” (J. De Groot, 2010). Такім чынам, пісьменнік эпохі постмадэрна дазваляе чытачу зрабіць самастойныя высновы і, як вынік, па-новаму зірнуць на падзеі мінулага.

Нельга цалкам сцвярджаць, што новыя тэндэнцыі істотна паўплывалі на ваенную тэматыку ў беларускай літаратуры, дзе нельганазіраць істотнае размыванне ці дэкананізацыю традыцыйнай гісторыі, адмову ад фігуры аўтара як крыніцы маральных высноў, ці спробы сатырызацыі і іроніі над трагічным. Па словах Л. Сіньковай, “ёрніцтва і цынізм, экзістэнцыйны тупік постмадэрнісцкай эпохі дысаніруюць з патрэбамі нацыі, для якой усё яшчэ актуальнымі застаюцца духоўныя задачы эпохі рамантычнай, эпохі нацыянальнага Адраджэння” (Л. Сінькова, 1996).

Псіхадрама С. Балахонава “Пятнаццаць лішніх хвілін” (1993), якая перадае трагедыю вайны праз пакутлівасць выбару з кім змагацца, а з кім застацца, з’яўляецца слушным прыкладам таго, што беларуская літаратура пад уплывам пастмадэрнізму ўдала прытрымліваецца сваёй традыцыйнасці і не пазбаўляецца нацыянальнай ідэалагемы.

С. Балахонаў вядомы найперш сваім раманам “Імя грушы”, у якім аўтар кінуў “інтертекстуальны выклік” самому У. Эка і яго раману “Імя ружы”.

Апавяданне “Пятнаццаць лішніх хвілін” увайшло ў дадзены зборнік разам з дзвума іншымі творамі, прысвечанымі Другой сусветнай вайне, – “Ня руш майго страху” і “Сьмерць лютністы”. Адметнае ў гэтых тэкстах тое, што пераасэнсаванне трагічнай гісторыі вайны адбываецца праз мастацкую эксперыментальнасць аўтара – творчая гульня, наяўнасць “чорнага гумару” і іроніі, фрагментарнасць і хаатычнасць створанага пісьменнікам свету.

У першых радках твора адчуваецца правакатыўная інтэртэкстуальнасць, калі школьніца, стоячы ля дошкі, бадзёры чытае верш:

*Як радасьць для сябе, вайну я прывітаў*
*Радкоў маіх лірычнейшым салютам....*

Верш, напісаны паэтам М. Сяднёвым у чэрвені 1941 г., калі ён раптоўна апынуўся на волі, пасля затачэння ў турме НКУС у Мінску. Антысавецкая паэтычная дзейнасць пісьменніка зразумела выключыла яго на доўгія дзясяцігоддзі з літаратурнага жыцця краіны. Звяртаючыся да радкоў не дужа вядомага на радзіме верша, з аднаго боку, аўтар відавочна ідзе насуперак агульнапрынятай канцэпцыі гісторыі. З іншага боку, падзеі апавядання адбываюцца ў адным з дробных акругоў Беларусі падчас нямецкай акупацыі. Справядліва будзе адзначыць, што дзеля стварэння адносна рэалістычнай карціны свету аўтар не мог не звярнуцца да канкрэтных гістарычных рэалій, бо які яшчэ верш магла зачытваць школьніца 1940-х на акупаванай частцы Беларусі.

У дастаткова разгорнутай экспазіцыі апавядання аўтар уводзіць галоўнага героя, Барыса Макаравіча Аляксючыца, простага школьнага настаўніка. Апавяданне пачынаецца з адкрытага ўроку ў беларускай школе сярэдзіны 1942 года. Аўтар з пратакольнай дакладнасцю адзначае, як настаўнік па-майстэрску зводзіў у адно навучальныя, выхаваўчыя і развіццёвыя мэты, але і не забываўся на ідэалагічныя моманты.

Але, разам з тым, з пачатку апавядання становіцца зразумелым, што гэта не проста яшчэ адзін твор пра калабарацыю і людзей, якія пераступілі праз свае маральныя прынцыпы наўмысна ці са страху. Тым больш, што С. Балахоўнаў падмацоўвае падобную думку ўнутранымі перажываннямі самога настаўніка, які пад канец ўроку, калі наведвальнікі яго заняткаў, дырэктар і акруговы камісар з загадчыкам школьнага аддзелу выйшлі, непрыкметна вымацюкаўся, гледзячы на партрэт Гітлера на сцяне, што сведчыць аб першай завязцы канфлікту. Аўтар паступова падводзіць чытача да думкі, што фігура Барыса Макаравіча не такая ўжо і простая. Гэта пазней раскрыецца ў тым, што верны германскаму Рэйху настаўнік у сваім патаемным жыцці з’яўляецца ўдзельнікам камуністычнага падполля па мянушцы Істрабіцель.

Праз некаторы час аўтар ізноў пачынае сваю гульню з чытачом і разбурае толькі што створаны ім вобраз героя-падпольшчыка. Барыс Макаравіч быў арыштаваны яшчэ зімою 37-га, але тады галоўнаму герою пашанцавала – яго выпадкова вызваліў таямнічы чалавек у цывільным, калі арыштоваў ужо канваіраў арыштаванага падчас унутраных разборак у сістэме. Але праз некаторы час пасля пачатку вайны “вызваліцель” Барыса Макаравіча з’яўляецца ізноў і шантажом прымушае таго працаваць на падполле.

Такім чынам, перад чытачом паўстае вобраз чалавека, які быццам страціў усе сацыяльныя сувязі, а вайна робіць яго жыццё цалкам невыносным. Усё апавяданне прасякнута нясцерпным пачуццём адзіноцтва і адчужэння – Барыс Макаравіч увесь час знаходзіцца паміж двума агнямі ў свеце, дзе ён не патрэбны ні чужым, ні сваім. Галоўны герой пастаўлены ў абставіны без пазітыўнага ўспрымання рэальнасці, і нават элемент эратызму, якім стала мімалётная ноч з вучаніцай Надзейкай Шыло, з цяжкасцю прабівае безвыходнасць існавання Барыса Макаравіча.

Разам з тым аўтар вызначае і тую маральна-псіхалагічную дамінанту, якая звязвае Барыса Макаравіча з навакольным светам. Гэта нацыянальная ідэя, беларушчына яе сімвалам становіцца зборнік М. Багдановіча “Вянок”, які герой выкарыстоўвае як шыфр для сувязі з падполлем. Да і сама разгубленаць і страчанасць Барыса Макаравіча паўстае ўвасабленнем простага беларуса, які стаў ахвяраю гісторыі ў гульні вялікіх суседзяў.

У канцы апавядання адбывацца пэўная карнавалізацыя гісторыі, калі на мясцовым сходзе па праблемах ідэалогіі Трэцяга Рэйху на высвабаджаных ад бальшавізму тэрыторыях высвятляецца, што амаль усе прысутныя – гэта не калабаранты, а агенты НКУС. Галоўным сюрпрызам становіцца прысутнасць даручэнца гаўляйтера спадара Генрыка Галінкоўскага Ён і з’яўляецца тым самым вярбоўшчыкам, які прымусіў Барыса Макаравіча да супрацоўніцтва з падполлем. Вядома, што карнавальнае свята не абыходзіцца без пераапранання герояў, што сімвалізуе сабою перараджэнне. Але ў апавяданні С. Балахонава адчуваецца не перараджэнне адмоўных герояў, а адсутнасць гэтага перараджэння. Відазмяненне калабарантаў на супрацоўнікаў НКУС нічога не змяняе для галоўнага героя, бо яны ўсё роўна застаюцца яго ворагамі.

Узнікае заканамернае пытанне: ці можна абыходзіцца з настолькі “табуіраванай тэмай” у айчыннай літаратуры, зыходзячы з прынцыпаў постмадэрнісцкай гульні з гісторыяй і чытачом? Постмадэрнісцкія погляды С. Балахонава адлюстроўваюць моцнае жаданне зазірнуць у гісторыю, яшчэ раз разабрацца і пераацаніць яе без імкнення да змычкі з традыцыйным выкладаннем гістарычных фактаў. Справядліва заўважае В. Джумайла, калі разважае, што горкая іронія “вымушае зразумець, што вышэй гісторыі, сучаснасці і аповеду пра іх – непазбыўная памяць прапакуты і страх паўтарэння памылак, што становіцца апошняй апорай чалавецтву. Постмадэрнісцкая варыятыўнасць наратыва, маніпуляцыі з мовай-памяццю не здольныя разбурыць памяць пра боль, сорам і віну” (В. Джумайла, 2011).

Такім чынам, можна зрабіць высновы, что ў XXI ст. гістарычная проза працвягвае існаваць, але ўжо ў новым фармаце, калі аўтары, пераасэнсоўваючы канцэпцыю гісторыі, не адмаўляюцца ад жанру, а шукаюць шляхі яго мадэрнізацыі і адаптацыі да патрэбаў мастацкага светапогляду. Дзякуючы гэтаму і тэма вайны ў сучаснай беларускай літаратуры не становіцца архаічнай гісторыяй, а набывае новыя формы, якія адмаўляюць аджытыя прынцыпы “Si vis pacem, para bellum” і надаюць гэтай тэме гуманістычнае гучанне.